**Міхно, У**. Быць радавым на той вайне… / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2003. — 2 жн. — С. 2.

**БЫЦЬ РАДАВЫМ НА ТОЙ ВАЙНЕ…**



Кароткія ногі ў хлапечай рамантыкі. Яна заканчваецца там, дзе пачынаюцца суровыя рэаліі дарослага жыцця з палыновым прысмакам.Для радавога Леаніда Барысёнка падлеткавая рамантыка разам з культам блакітнага берэта ды прыгожага камуфляжу скончылася, мусіць, яшчэ ў вучэбцы, у Фергане, дзе паўгода рыхтавалі юнакоў-навабранцаў да аперацыі, змест якой трымалі ў сакрэце нават ад іх жа саміх. І вось сакрэт адкрыўся – Афганістан. Панурасць і разгубленасць на твары ва ўчарашніх хлопчыкаў. Змешанае пачуццё: адгалоскі ўсё таго ж рамантызму і – страх, той самы страх за жыццё, уласцівы кожнаму нармальнаму чалавеку. Тым болей, што жыццё яшчэ такое маладое. А іх на самалёце і – у Кабул. Што яны ведалі тады пра вайну, якая неўзабаве павінна была скончыцца? Неўзабаве, але ж яшчэ не сёння. Ішоў май 1987-га. Што ведалі? Расказваў камбат Ключнікаў, які толькі што вярнуўся адтуль, тры гады правёўшы на вайне. Ён раіў хлопцам там, у сапраўдным пекле, не лавіць мух, не кідаць у бядзе сяброў і не хаўруснічаць з ворагам. Ён ведаў, што казаў, бо яму дазвалялі быць іх духоўным настаўнікам два баявыя раненні і два ордэны Чырвонай Зоркі.

А ў Кабуле ўсё ішло сваім парадкам, па-будзённаму празаічна. Па алфавіту адлічылі сем чалавек і на грузавіку накіравалі ў Джэлалабад. Леанід помніць, калі прыехалі ў казарму, было чатыры гадзіны раніцы, але на вуліцы стаяла страшэнная спякота – сапраўднае пекла. У казарме, акрамя двух днявальных і дзяжурнага, нікога не было. Так і жылі яны адны трое сутак, пакуль не вярнулася з баявога задання рота – запыленая, змарнелая, брудная – не на дыскатэку ж хадзілі. І – усё тое ж пачуццё разгубленасці хавалася ў вачах пацаноў. Праз два тыдні ён, Леанід, і сам адправіцца на такое ж заданне. А пакуль – жыві, хлопец! Як раптам ненаўмысна страшную вестку прынесла пошта: загінуў сябар Валодзя Мяцеліца, які таксама ваяваў у Афганістане. А хутка, проста на вачах, пры першым жа абстрэле, заб'юць яшчэ аднаго таварыша – Сяргея Швяцова. І для яго, Леаніда Барысёнка, той бой стане першым баявым хрышчэннем.

Забыўся спытаць, ці верыць ён у Бога? Зрэшты, пытанне прагучала б рытарычна, бо на вайне без Бога, напэўна, не пражывеш і хвіліны, не тое, што цэлы доўгі год. Менавіта столькі – з 15 мая 1987 па 15 лютага 1988 года – ваяваў у Афганістане радавы Барысёнак. У першай калоне яны ўвайшлі ў Саюз. А вайна яшчэ доўга будзе сніцца ў кашмарных снах. То праследуюць банду ў

Хісаране, то канваіруюць калоны, то сядзяць у засадзе, пільнуючы варожыя караваны. Аднойчы ён бачыў сваіх ворагаў зблізку, метраў за сто, хлопцы нават разгубіліся, пачалі страляць па душманах.

Але тыя ці то былі вельмі п'яныя, ці «гулялі пад кайфам», нават не рэагавалі на стральбу. У хлопцаў ад хваляваня аж рукі хадуном захадзілі. Забіць чалавека – гэта вельмі складана. Трэба мець асобы склад характару. Вайна скончылася. І пасля яшчэ чатыры месяцы яны даслужвалі ў Прымор'і, на самай кітайскай мяжы. Ніхто іх не чапаў болей, служылі як на курорце. На граніцу адзін раз, як на экскурсію звадзілі... Яны заслужылі адпачынак...

У кашулях нарадзіліся. Яны, Леанід Барысёнак і яго зямляк Міхаіл Рубанік, прайшлі радавымі праз вайну, не маючы ніводнага ранення, ніводнага нават шраму. Абодва раслі ў суседніх вёсках, пад Лепелем, вучыліся ў адной школе. Абодвух разам забралі ў войска і – у Афганістан, у дэсантна-штурмавы батальён.

Вайна, аднак, пакінула іншыя шрамы – на душы, якія гояцца аж дагэтуль. І таму, калі былыя дэсантнікі, прайшоўшыя праз Афганістан, кульнуць часам іншую чарку на свята, не спяшайцеся іх асуджаць. Надта многа ўзвалілі яны на свае плечы. І ці маем мы права судзіць іх? Бог рассудзіць...

Неўзаметку вырас у Леаніда сын, выбраўшы прафесію абслугоўвання самалётаў. Вадзім таксама збіраецца адслужыць у войску, і бацька ўхваляе выбар сына. Падрастае дачка. Толькі б – не на вайну.

Няхай жа нас усіх абміне вайна...

**У. Міхно**